***Панькова С. Л.****, настаўнік пачатковых класаў гімназіі № 1 імя Д. І. Валковіча г. Масты Гродзенскай вобласці*

# Займальная вандроўка
# «Пяць крокаў да роднай мовы»

***Мэта:*** садзейнічаць фарміраванню павагі да беларускай мовы.

***Задачы:*** узбагачаць слоўнікавы запас малодшых школьнікаў, развіваць памяць, мысленне; вучыць дзейнічаць у камандзе; выхоўваць нацыянальную самасвядомасць, патрыятызм і любоў да Радзімы.

***Абсталяванне:*** канверты з прыказкамі, воблака слоў, малюнкі з прадметамі.

А гэта — вандроўка праз сёлы,
Праз край мой шырокі, вясёлы,
Бясконцыя нівы, дубровы —
У маю беларускую мову.

*Максім Танк*

**1. Арганізацыйны этап.**

— Эпіграфам да мерапрыемства ўзяты словы Максіма Танка. Здагадайцеся, пра што пойдзе гаворка сёння?

**2. Паведамленне тэмы мерапрыемства.**

— Мая беларуская мова… А якая яна? Непаўторная, мілагучная, сакавітая… Таямнічая, мудрая, самабытная… Менавіта такая наша родная беларуская мова! Беларускі край… Гэта тая зямля, дзе спакон вякоў чулася і сёння чуецца гучанне роднага слова. Словы злятаюць з вуснаў, звіняць у паветры, напаўняюць прастору. Люба слухаць жывую народную гаворку.

21 лютага ў адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Кожны чалавек, які жыве ў Беларусі, павінен ведаць сваю мову, умець спяваць песні на роднай мове, расказваць вершы.

Хто з вас любіць падарожнічаць? Я прапаную ўсім разам адправіцца ў займальную моўную вандроўку. Мы адправімся ў падарожжа па краіне нашай роднай мовы, пазнаёмімся з вытокамі народнай мудрасці, пагуляем у перакладчыкаў і на некалькі крокаў станем бліжэй да роднай мовы.

## 1 прыпынак «Мая мова — старажытная»

— Беларуская мова — найвялікшы нацыянальны скарб. Народ пранёс яе праз вякі. Наша мова — адна са славянскіх моў. Шлях яе быў складаны, але беларусы размаўлялі на сваёй роднай мове. Беларускі народ вельмі таленавіты. Шмат складзена загадак, прымавак, прыказак і, вядома, казак.

***Заданне «Раскажыце казку».***

— Калі вы былі зусім маленькімі, бабулі і матулі чыталі вам казкі. Успомніце казку па малюнку і перакажыце яе на беларускай мове.



*(Беларуская народная казка «Лёгкі хлеб».)*

## 2 прыпынак «Мая мова — сакавітая»

— Роднае слова! Яшчэ малымі чуем мы яго з матчыных вуснаў. Яно тлумачыць нам усе дзівы свету, якія дзіцячыя вочы бачаць вокал сябе першы

раз. Кожнае беларускае слова — роднае, знаёмае з дзяцінства. А якая сакавітая і каларытная мова ў вясковых бабуль — заслухаешся!

***Заданне «Бабуліна прымаўка».***

— Разгледзьце малюнкі з выявамі бохана хлеба, слоіка мёду, шматка сала, кавалка масла. Назавіце прыказкі і прымаўкі, у якіх упамінаецца гэтая ежа.






*(Хлеб — усяму галава. Хлеб і вада — то не бяда. Без працы няма чаго хлеба шукаці.*

*Мёд на стале — здароўе ў доме. Адна пчала мёду не наносіць. Дрэннае слова і салодкім мёдам не зап’еш.*

*Сытаму сала не сніцца. Салам без хлеба гасцей не частуюць.*

*Маслам кашы не сапсуеш, але з аднаго масла кашы не зварыш. У добрай гаспадыні ёсць сала і масла ў скрыні.)*

***Заданне «Сакавіты яблык».***

— Знайдзіце ў «воблаку» словы, у якіх ёсць гук [с’].




*(Незалежнасць, талерантнасць, вясёлка, бусел, сябры, весялосць, сям'я, шчасце, сінявокая, прыгажосць, здзяйсненне, прыязнасць.)*

**3 прыпынак «Мая мова — займальная»**

— Беларуская мова цікавая і незвычайная. У беларускай мове ёсць шмат слоў, якія змогуць узняць настрой вашаму суразмоўцу, дапамогуць быць ветлівым і культурным, пашыраць кругагляд.

***Заданне «Пагуляем у алфавіт».***

— Пакладзіце ў рукзак толькі тыя прадметы, назвы якіх пачынаюцца з літары ***В*** (толькі назоўнікі).





*(Вядро, відэлец, вясло, вяроўка, вавёрка, вілы, воўна, ванілін, вата, вопратка, вінаград і г. д.)*

***Заданне «Знайдзі слова».***

— З літар словазлучэння РОДНАЯ МОВА складзіце новыя словы.

*(Дамова, варона, народ, модная, род, мора, вада, мода, яма, яр, ярмо, Яна, Рая і г. д.)*

### 4 прыпынак «Мая мова — мілагучная»

— Беларуская мова — адна з самых мілагучных, як песня. Яна цёплая і ласкавая, як матуліна ўсмешка, такая родная, блізкая — наша. Яна звонкая, нібы спеў салаўя і звон капелі ранняй вясной. Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова прамовіць некалькі слоў тыпу *шчырасць*, *зычлівасць*, *пяшчота*. Гэта адбываецца ў першую чаргу з-за мяккасці, якая перадаецца ад суседніх гукаў, вялікай колькасці адкрытых складоў, наяўнасцю ў мове адметнага гука [ў]. Нездарма беларуская мова ўваходзіць у топ-5 моў свету па мілагучнасці.

***Заданне «Знайдзі рыфму».***

— Прыгадайце словы, якія рыфмуюцца са складамі, і складзіце чыстагаворку.

Жа-жа-жа —

Жу-жу-жу —

Жы-жы-жы —

Жо-жо-жо —

***Заданне «Апішы прадмет».***

— Апішыце прадмет з дапамогай прыметнікаў.









*Самалёт (вялікі, далёкі, ваенны. цацачны і г. д.).*

*Шар (вялікі, зялёны, markзнакаляровы, сапраўдны і г. д.).*

*Елка (зялёная, лясная, пушыстая, калючая і г. д.).*

*Вочы (карыя, вялікія, добрыя, вясёлыя і г. д.).*

### 5 прыпынак «Мая мова — сучасная»

— Сёння беларуская мова папулярна і любіма. Усё больш і больш беларусаў размаўляюць на роднай мове. Ёю карыстаюцца, таму што яна... неабходная. А гэта гаворыць пра яе будучыню.

***Заданне «Апранайся па-беларуску».***

— Да рускіх слоў на тэму «Адзенне» падбярыце беларускія адпаведнікі.



| | |
|---|---|
| рубашка | |
| юбка | |
| штаны | |
| носки | |
| чулки | |
| жилетка | |

*(Кашуля, спадніца, нагавіцы, шкарпэткі, панчохі, камізэлька.)*

***Заданне «Кухня».***

— Да рускіх слоў на тэму «Кухня» падбярыце беларускія адпаведнікі.

Кастрюля, стакан, банка, вилка, ложка, сковорода, нож, чашка, бутылка.

*(Каструля, шклянка, слоік, відэлец, лыжка, патэльня, нож, кубак, бутэлька.)*

**3. Падвядзенне выніку мерапрыемства.**

— Ад нашых продкаў-беларусаў нам у спадчыну засталася мова — песенная і паэтычная, багатая і зразумелая, жывая і мілагучная, празрыстая і звонкая, старажытная і сучасная. Яна у нас — адна. Самая родная. Самая блізкая. Самая жаданая. Дык давайце будзем берагчы яе, вывучаць і карыстацца ёю. Хай заўсёды гучыць мова роднай зямлі, мова беларускага народа.

Закончыць нашу вандроўку мне хацелася б словамі Юрася Свіркі:

…Хацеў бы я,
Каб ты не забывала,
Што мову я не для сябе бярог.
Хацеў бы я,
Каб ты размаўляла,
Каб папраўляць цябе ніхто не змог.
Дачка мая, хачу, каб шлях кароткі
Да шчасця быў,
Каб ты яго знайшла,
Каб мову ты
Сваіх бацькоў і продкаў,
Як вернасць, як сумленне,
Берагла.